Я. В. Есіс

# БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА

## ПЛАНЫ-КАНСПЕКТЫ ЎРОКАЎ

## 8 клас

## (I паўгоддзе)

Дапаможнік для педагогаў устаноў
агульнай сярэдняй адукацыі

Мазыр
«Выснова»
2021

# Ад аўтара

Выданне складаецца з 23 планаў-канспектаў урокаў па беларускай літаратуры ў 8 класе на I паўгоддзе. Матэрыял пададзены ў адпаведнасці з вучэбнай праграмай для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання «Беларуская літаратура. 8 клас» (Мінск: НІА, 2018).

У дапаможніку прадстаўлены ўрокі па раздзелах «Уводзіны», «Роды мастацкай літаратуры», «Лірычныя песні», якія прысвечаны аналізу праграмных мастацкіх твораў для чытання і вывучэння, удасканаленню пісьмовага маўлення вучняў (творчыя ўрокі).

Прапанаваныя распрацоўкі ўрокаў пабудаваны ў залежнасці ад тэмы, накіраваны на рэалізацыю пастаўленай мэты і дасягненне акрэсленых задач. Планы-канспекты распрацаваны з улікам патрабаванняў адукацыйнага стандарта і канцэпцыі вучэбнага прадмета «Беларуская літаратура», скіроўваючы ўвагу на рэалізацыю кампетэнтнага падыходу ў вывучэнні айчыннага слоўнага мастацтва.

Метадычныя распрацоўкі носяць рэкамендацыйны характар. З прапанаванага дапаможніка настаўнік зможа выбраць неабходнае і патрэбнае, на яго думку, з улікам узроўню падрыхтаванасці вучняў.

Матэрыял будзе карысны настаўнікам беларускай літаратуры, студэнтам філалагічных факультэтаў па спецыяльнасці «Беларуская філалогія».

# УВОДЗІНЫ

## Урок 1

## ЛІТАРАТУРА ЯК ВІД МАСТАЦТВА. ЧАЛАВЕК ЯК ГАЛОЎНЫ АБ’ЕКТ ЛІТАРАТУРЫ

**Мэта:** мяркуецца, што напрыканцы ўрока вучні:

***будуць ведаць:*** асаблівасці літаратуры як мастацтва слова, аб паэзіі і прозе як спосабах паказу жыцця;

***авалодаюць паняццямі:*** эпас, лірыка, драма;

***удасканаляць навыкі:*** складання гексаў.

**Задачы выхавання і развіцця асобы вучняў:** стварыць умовы для абуджэння цікавасці да нацыянальнай літаратуры; аналітычнага мыслення вучняў, навыкаў слухання і канспектавання; садзейнічаць выхаванню маўленчай культуры вучняў.

**Абсталяванне:** партрэты мастакоў слова і выстава кніг твораў, якія будуць вывучацца на працягу навучальнага года.

**Эпіграф:** «Асноўная, глабальная, пастаянная задача пісьменніка — будзіць чалавека ў чалавеку...» (Янка Сіпакоў).

### Ход урока

### I. Арыенціровачна-матывацыйны этап

**1.1.** Арганізацыйны момант. Стварэнне псіхалагічнага настрою.

**1.2.** Афармленне вучнёўскіх сшыткаў (рабочых).

**1.3.** Знаёмства з вучэбным дапаможнікам па беларускай літаратуры для 8 класа, яго структурай, асаблівасцямі выкладання прадмета.

**1.4.** Слова настаўніка.

— У гэтым навучальным годзе на ўроках беларускай літаратуры мы будзем адкрываць новыя імёны, чытаць мастацкія творы, пашыраць вядомае, спазнаваць індывідуальнасць мастакоў слова, пры гэтым не будзем забываць асноўнае — пазнаваць навакольны свет і таямнічы свет чалавека праз іх мастацкае адлюстраванне і ўспрыманне. Пазнанне літаратуры — гэта вельмі складаны працэс. Чытаючы, мы можам абараняцца, спачуваць, ненавідзець, любіць.

— Прыгадайце, калі ласка, творы мастацкай літаратуры, якія вы чыталі раней, летам. З якім настроем чытаўся той ці іншы твор? *(Адказы вучняў.)*

— Што асабліва запомнілася? Што выклікала радасць або засмучэнне? *(Адказы вучняў.)*

Чытанне мастацкіх твораў у нас, чытачоў, выклікае асалоду, пашырае нашы веды пра чалавека і жыццё, выхоўвае таго, хто ўмее ўважліва чытаць.

Чытанне — гэта ўменне не проста асэнсавана разумець прачытанае, але і працэс дамалёўкі вобразаў, ухваляць або адмаўляць тое, што хвалюе герояў канкрэтнага мастацкага твора.

**1.5.** Актуалізацыя раней вывучанага.

— На вашу думку, што з'яўляецца галоўным (ключавым) у літаратуры?

— Успомніце, што адрознівае літаратуру ад іншых відаў мастацтва.

— Што вы звычайна чытаеце?

— Які працэнт з прачытанага займае беларускамоўная літаратура? Чаму? *(Адказы вучняў.)*

**1.6.** Мэтавызначэнне.

Вучні самастойна фармулююць мэты ўрока, запісваюць у свае сшыткі, працягнуўшы выразы:

*даведаюся... *вызначу... *выкарыстаю...

## II. Пазнавальны этап

**2.1.** Прыкладны змест лекцыі.



*Заданне.* Праслухайце, калі ласка, лекцыю «Роды і жанры мастацкай літаратуры», занатуйце яе тэзісна (па варыянтах: I — эпас, II — лірыка, III — драма). Свой адказ аформіце ў выглядзе гексаў.

Мастацкія творы адрозніваюцца па спосабе адлюстравання рэчаіснасці (знешні ці ўнутраны па адносінах да аўтара свет), спецыфіцы вобразнасці, мастацкай форме, аб'ёме, моўным афармленні, асаблівасцях эстэтычнага ўспрыняцця.

Літаратурныя роды і жанры сфарміраваліся яшчэ ў Старажытнай Грэцыі. Таму нам трэба заглянуць у далёкую гісторыю чалавецтва. Вучоныя называюць першабытным сінкрэтычным мастацтвам такое, у якім яшчэ былі зліты ў адзінае цэлае танец, музыка і слова. Менавіта так нашы далёкія продкі паведамлялі адно аднаму пра ўдалае паляванне ці перамогу над ворагам.

Розныя віды мастацтва маюць агульныя карані. Яшчэ цяжэй правесці мяжу паміж рознымі родамі, відамі і жанрамі літаратуры. Тым не менш мяжа гэтая ёсць, і менавіта яна вызначае мастацкую спецыфіку твора.

Паэзія — адзін з асноўных відаў мастацтва слова, эмацыянальна-вобразная вершаваная творчасць, якой уласціва павышаная эмацыянальнасць і музычны пачатак.

Проза — адзін з двух асноўных відаў літаратурна-мастацкай творчасці, невершаваная літаратура, якая не мае закончанай сістэмы рытмічных паўтораў і развітых вобразна-выяўленчых сродкаў.

Непасрэднай залежнасці ад прозы ці паэзіі падзел твораў на роды (эпас, лірыка, драма) не мае, аднак усё ж эпічныя творы часцей пішуцца прозай, лірычныя адносяцца да паэзіі, драма ж можа выкарыстоўваць як празаічную (у сучаснай літаратуры часцей), так і паэтычную (звычайна ў старажытнасці і ў XVIII — XIX стагоддзях) форму.

Падзел літаратуры на роды і жанры склаўся ў антычнай літаратуры. Самы старажытны род літаратуры — эпас, які паведамляе пра падзею — таксама з самага пачатку быў рытмізаваны. Гамераўскія «Іліяда» і «Адысея» — эпічныя творы — мелі вершаваную форму. Калі чалавецтва зразумела значнасць асабістых пачуццяў кожнага, узнікла лірыка — вершаваныя творы, якія ў Старажытнай Грэцыі выконваліся пад акампанімент музычнага

## Урок 23

# ПАДАГУЛЬНЕННЕ. ЛІРЫКА І ЛІРЫЧНЫЯ ЖАНРЫ

**Мэта:** мяркуецца, што напрыканцы ўрока вучні:

***будуць ведаць:*** асаблівасці пабудовы раздзела «Голасам душы і сэрца», умець вызначаць жанр лірычнага твора;

***авалодаюць паняццямі:*** лірыка, лірычныя жанры;

***удасканаляць навыкі:*** складання гексаў.

**Задачы выхавання і развіцця асобы вучняў:** стварыць умовы для абуджэння цікавасці да нацыянальнай літаратуры; аналітычнага мыслення вучняў, навыкаў слухання і канспектавання; садзейнічаць выхаванню маўленчай культуры вучняў.

**Абсталяванне:** зборнікі беларускай паэзіі.

**Эпіграф:** Народ — пясняр, народ — паэт.
Народ без паэзіі? Недарэчнасць.
Паэзія — самы няўлоўны сакрэт,
Які не будзе нікім рассакрэчаны. (Пімен Панчанка).

## Ход урока

### І. Арыенціровачна-матывацыйны этап

**1.1.** Арганізацыйны момант. Стварэнне псіхалагічнага настрою.

**1.2.** Мэтавызначэнне.

Вучні самастойна фармулююць мэты ўрока, запісваюць у свае сшыткі, працягнуўшы выразы:

*даведаюся... *вызначу... *выкарыстаю...

### ІІ. Пазнавальны этап

**2.1.** Настаўнік выразна чытае верш «Вечны запавет» А. Лойкі на памяць.

**2.2.** Слова настаўніка.

Працэсу стварэння лірычнага твора папярэднічае нейкае ўнутранае пакліканне ці назапашванне эмоцый, думак. Для гэтага дастаткова літаральна дробязі: рэплікі, руху, промня на вадзе ці ў люстэрку, начніцы ў святле, вулічнага ліхтара. Імгненне — і ўнутры нешта затрымцела, запаланіла ўсю істоту, звяла свядомасць да аднаго — да ўслухоўвання ў самога сябе, дзе з нейкіх

## Літаратура


1. Беларуская літаратура: зборнік творчых заданняў для тэматычнага кантролю: 5—9 класы : дапам. для настаўнікаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі з бел. і рус. мовамі навучання / І. М. Гоўзіч [і інш.]. Мінск, 2012.
2. *Есіс, Я. В*. Беларуская літаратура: планы-канспекты ўрокаў. 8 клас (І паўгоддзе) : дапам. для настаўнікаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі / Я. В. Есіс. Мазыр, 2017.
3. *Карухіна, В. А*. Урокі беларускай літаратуры ў 8 класе : вучэб.-метад. дапам. для настаўнікаў устаноў, якія забяспечваюць атрыманне агульнай сярэдняй адукацыі, з бел. і рус. мовамі навучання / В. А. Карухіна, П. І. Лявонава, І. М. Слесарава. Мінск, 2006.
4. *Лявонава, П. І.* Беларуская літаратура ў 8 класе : вучэб.-метад. дапам. для настаўнікаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі з бел. і рус. мовамі навучання / П. І. Лявонава, В. І. Русілка, І. М. Слесарава. Мінск, 2012.
5. *Лявонава, П. І.* Беларуская літаратура: 8 клас: тэставыя і тэматычныя заданні : дапам. для настаўнікаў устаноў, якія забяспечваюць атрыманне агульнай сярэдняй адукацыі, з бел. і рус. мовамі навучання / П. І. Лявонава, І. М. Слесарава. Мінск, 2005.
6. *Ляшук, В. Я*. Вывучэнне творчасці Максіма Багдановіча ў школе : дапам. для настаўнікаў / В. Я. Ляшук. Мінск, 2008.
7. *Ляшук, В. Я*. Вывучэнне творчасці Якуба Коласа ў школе : дапам. для настаўнікаў / В. Я. Ляшук. Мінск, 2006.
8. *Навуменка, І. Я*. Вывучэнне творчасці Максіма Багдановіча ў школе : дапам. для настаўнікаў / І. Я. Навуменка, Т. І. Мароз. Мінск, 2001.
9. *Пінголь, І. А*. Беларуская літаратура: 8 клас: дыдактычныя і дыягнастычныя матэрыялы : дапам. для настаўнікаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі з бел. і рус. мовамі навучання / І. А. Пінголь. Мінск, 2019.
10. *Рубцава, Л. У*. Літаратурныя міні-тэсты па раздзеле «Лірычныя жанры» / Л. У. Рубцава // Беларуская мова і літаратура. 2014. № 10. С. 21—23.
11. *Русілка, В. І.* Незвычайнае літаратуразнаўства: вывучэнне твора ў яго родавай і жанравай спецыфіцы: 8 клас : дапам. для настаўнікаў агульнаадукацыйных устаноў з бел. і рус. мовамі навучання / В. І. Русілка. Мінск, 2010.

# Змест

Ад аўтара . . . 3

УВОДЗІНЫ

Урок 1. Літаратура як від мастацтва. Чалавек як галоўны аб'ект літаратуры . . . 4

РОДЫ МАСТАЦКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

Урок 2. Рыгор Барадулін. Верш «Трэба дома бываць часцей» . . . 10
Урокі 3—4. Віктар Карамазаў. Апавяданне «Дзяльба кабанчыка» 15
Урок 5. Аляксей Дудараў. Меладрама «Вечар» . . . 23
Урокі 6—7. Аляксей Дудараў. Меладрама «Вечар». Характары стыка герояў твора . . . 27
Урок 8. Падагульненне. Тры мастацкія аблічча адной праблемы 33

ЛІРЫЧНЫЯ ЖАНРЫ

Урок 9. Народныя песні. «Бяроза з лістом...», «Зелянеюць, зеленеюць лугі, сенажаці...» . . . 37
Урок 10. Грамадзянская лірыка. Янка Купала. Верш «Спадчына» 41
Урок 11. Максім Багдановіч. Верш «Слуцкія ткачыхі» . . . 47
Урок 12. Уладзімір Караткевіч. Верш «Беларуская песня» . . . 52
Урок 13. Філасофская лірыка. Максім Танк. Верш «Шчасце» . . . 58
Урок 14. Анатоль Вярцінскі. Верш «Жыццё даецца, каб жыццё тварыць...», Генадзь Пашкоў «Пазвоніць аднойчы вясна...» 64
Урок 15. Інтымная лірыка. Аркадзь Куляшоў. Верш «Бывай...» . . . 73
Урок 16. Максім Багдановіч. Верш «Раманс» . . . 78
Урок 17. Пятрусь Броўка. Верш «Пахне чабор» . . . 83
Урок 18. Пейзажная лірыка. Якуб Колас. Урывак «О, край родны, край прыгожы!..» (з паэмы «Сымон-музыка)», Міхась Башлыкоў «Верасень» . . . 88
Урок 19. Максім Багдановіч. Верш «Цёплы вечар, ціхі вецер, свежы стог...» . . . 95
Урок 20. Класічныя (цвёрдыя) формы верша. Максім Багдановіч. «Санет» («Замёрзла ноччу шпаркая крыніца...»), Анатоль Вярцінскі. Актава. «Свяці, кахання чыстая зара!..» . . . 100
Урок 21. Максім Багдановіч. «Трыялет» («Калісь глядзеў на сонца я...»), Данута Бічэль. «Трыялет» («Лёгкія сняжынкі ў цішы...») . . . 108
Урок 22. Творчая работа. Водгук на лірычны твор . . . 114
Урок 23. Падагульненне. Лірыка і лірычныя жанры . . . 116

Літаратура . . . 119